Цана асобнага нумару 15 гр.

Przesyłka opłacona ryczałtem.

№ 19 (70). Вільня, Субота 26 Лютага 1927 г. Год III

СЯЛЯНСКАЯ НІВА

Няхай жыве Беларускі Народ!

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, ЗАВАЛЬНАЯ 6. (Wilno, Zawalna 6.).

Рэдакцыя адчынена штодня ад 9 да 3 гадзіны апрача сьвята.

Рэдактар прыймае ад 12 да 2 гадз.

Зямля Сялянству бяз выкупу!

Падпіска:

на адзін месяц — 1 зал., на 3 месяцы — 2 зал., на 6 месяцаў 4 зал., на год — 8 зал.

Для заграніцы удвая даражэй.

Аплата надрукаванага залежыць ад рэдакцыі

ВЫХОДЗЕ Ў СЕРАДУ І СУБОТУ.

ОРГАН БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСКАГА САЮЗУ.

Сучасныя падзеі.

У тую гадзіну, калі ахвяры Касаўскіх крывавых падзеяў праводзіліся на месца заўсёднага супакою, здарылася ізноў забурэньне. На гэты раз ужо ў самай масе, на самым дне сялянскага мора ў вёсцы Малым Галіку...

Пасьля гэтага тое самае здарылася і ў Слоніме... Праўда, на гэты раз кончылася толькі на адным штыхавым уколе, але самы факт астаўся на заўсёды фактам. І вось, увесь час польскія газэты прыносілі нам і прыносяць смутныя весткі, поўныя жаху і трагізму, аб крывавых падзеях на нашай зямлі!...

Мы ня можам прайсьці моўчкі над здарэньнямі ў Заходняй Беларусі, дзеля гэтага мусім прыпыніцца і глянуць глыбей у самаю сутнасьць, знайсьці корань тых прычынаў, якія выклікалі іх і якія, магчыма, могуць выкікаць новыя забурэньні.

Перадусім глянем, што гаворыць „Kurjer Wileński“: „Так трэба ўрадаваць, — кажа аўтар артыкулу вядомы п. Срокоўскі, — каб падуладных да гэтых урадаў прызвычаіць, каб адчувалі яны сябе (падуладныя), сярод іх (урадоўцаў) адносна шчасьлівымі, каб мелі ясную цікавасьць у іх падтрыманьні, калі не з ідэйных, дык хоць-бы з апартуністычных паглядаў. Стацца гэта можа толькі ў двух выпадках, або тагды, калі дзяржава цераз вялікае матэрыяльнае багацьце запэўніць кожнаму максімум дабрабыту, як гэта было ў Немцаў, або тагды, калі падуладныя будуць пакліканы да рэальнай супольнай працы. Мы ані аднаго, ані другога ня робім. Мы не праводзім вялікай інвэстыцыйнай палітыкі і не дазваляем, каб падуладныя нам народы адчувалі сябе як дома і самі аб сабе думалі“.

Дык вось у гэтым, і увесь трагізм наш і польскай дзяржаўнасьці, грамадзянамі якое, мы афіцыяльна зьяўляемся.

Будучы гэтакімі, мы маем канстытуцыю, якая забясьпечвае нам вольнасьць і роўнасьць; маем Вэрсальскі і Рыскі трактаты; маем „языковыя ўставы“ і пры ўсім гэтым маем — поўнае ігнараваньне ўсіх гэтых фундамэнтальных законаў, бо дагэтуль прышлы элемент, рознага роду ўрадоўцаў займае ўсе ўстановы на нашых землях; наша інтэлігенцыя астаецца бяз працы, наша сялянства — без зямлі, тагды, калі лепшыя абшары заняты пад вайсковае асадніцтва і цывільнымі калянiстымі. Мы ня маем самаўраду выбранага народам; замест гэтакага, маем самаўрад вызначаны панамі старостамі, кіраўніцтва ў якім аддана, пераважна, прышлым элемэнтам. Мы ня маем роднае школы; беларускія дзеткі змушаны вучыцца ў польскіх школах мэтодамі і пад кіраўніцтвам галіцыйскага вучыцельства, якое незнаёма з умовамі нашага жыцьця. Дык вось, дзе крыніца апошніх трагічных падзеяў.

Падаючы гэтыя факты мы ня хочам рабіць нікаму ніякіх закідаў, мы ня зьбіраемся пагражаць, мы толькі хочам зьвярнуць на іх увагу адказных павадыроў польскай шовіністычнай і буржуазнай палітыкі і заявіць проста, што-ні-ёсьць у самы катэгарычны спосаб, што быць гэтак як ёсьць далей ня можа.

Нам дорага і патрэбна жыцьцё на'т аднэй адзінкі, а дзеля таго ў тысяча першы раз заяўляем, што годзі іграць у камуністычнасьць, пара прыйсьці да перакананьня, што сутнасьць усяго трэба трактаваць ня гэтак, як гэта робіць нейкі Каўнацкі ў „Dzieńniku Wileńskim“, бо гэты ўвесь рух творыць Беларускі Народ ідучы за сваім прадстаўніцтвам. Пускаючы ў сьвет гэтыя словы мы ня маем на мэце ніякага падбураньня. Мы дамагаемся для Беларусоў усіх належных ім правоў.

Разам з гэтым мы таксама заяўляем, што калі і далей будзе тое што ёсьць цяпер, дык катастрофы і то самай страшнай і жудаснай не мінаваць. Мы хочам спытацца: каму і якая ёсьць карысьць ад таго, што пала некалькі ахвяраў і каму і якая будзе карысьць калі здарыцца нешта горшае?!

Прамова пасла Рагулі

ў Сойме 30.I с. г. пры дыскусіі над бюджэтам мін. асьветы.

Высокая Палата! Мы ня бралі голасу ў агульнай дыскусыі над бюджэтам ня дзеля таго, што ня маем нічога сказаць, наадварот маем вельмі шмат чаго сказаць, але выключна дзеля таго, што маем у сваім распараджэньні на ўвесь бюджэт, на ўсе міністэрствы толькі 48 мінут. Мы пастанавілі выкарыстаць гэтыя мінуты на тое, каб выступіць пры абгаворах бюджэту паасобных міністэрстваў. Агульная сума, якая прэлімінавана (прызначана) на міністэрства веравызнаньня і асьветы даходзіць да 325.666.827 зл. Сума досьць вялікая і значны процант гэтай сумы, гэта ёсьць крывавы пот беларускага народу, значны процант гэтай сумы сьцягваецца з беларускага селяніна, сьцягваны часта дарогай прадажы яго падушак, а мо' нават яго кашулі. І што-ж дастаём, што беларускі народ дастае з гэтых сьцягнутых падаткаў? Калі заглянём у бюджэт міністэрства асьветы, дык можам проста, ясна і цьвёрда сказаць, што не атрымлівае беларускі народ ані воднага граша на школы і вельмі невялічкую суму на рэлігійныя справы. Конституцыя, а таксама вэрсальскі трактат гварантуюць нам, як аднэй з нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, права да сваей уласнай культуры, шанаваньня (узгадоўваньня) сваей мовы і сваей нацыянальнасьці.

Аднак усе натугі Беларусаў у гэтым кірунку разьбіваюцца аб польскую рэакцыю (Голас: На тым боку ёсьць рэакцыя). На жаль мушу сьцьвердзіць, што і на тым баку, бо мы мелі рожныя ўрады, былі з гэтага боку і з таго, і ўсё роўна, адныя варты другіх.

І вось, каб затрымаць, каб здушыць зусім беларускі культурны і асьветавы рух, дык усякага культуральнага беларускага дзеяча падводзіцца пад камунізм і прасьледуецца яго, як камуністага. Падведзена пад гэта нават беларускіх паслоў, аставіўшы толькі палавіну сучаснага беларускага прадстаўніства на волі, думаю што не на доўгі час, а другую палавіну пасаджана ў вастрог і з бюджэту міністэрства справядлівасьці даецца ім хлеб і вада — з беларускай працы. Дык барацьба ідзе не з камунізмам, толькі заўзятая барацьба з беларускім народам, з яго нацыянальнымі імкненьнямі. На гэтую барацьбу мусім адказаць безадступнай барацьбой, нічога не баючыся.

Калі заглянём у беларускае школьніцтва, дык там знайдзём пустку. Мой прадмоўца гаварыў аб нямецкіх школах, аб школах украінскіх. Ня ведаю, ці даваў ён дакладныя даныя, ці не дакладныя, а ўсё-ж такі гаварыў, што там нешта ёсьць, але ня мог нічога сказаць аб беларускіх школах, бо нічога няма. Ані воднай урадавай школы беларускай ня маем. Маем толькі адну прыватную школу ў Рудаўцы, Слонімскага павету; што датычыцца ўтраквістычных школаў, дык скажу пану, Пане Міністар, што і ўтраквістычных школ на Беларусі няма, там ёсьць нейкая карыкатура ўтраквізму (двуязычнасьці). У праграме лекцыяў ёсьць толькі 2 гадзіны на тыдзень беларускай мовы і пры гэтым гэную беларускую мову выкладае Паляк, які нічога не разумее пабеларуску. Дык тыя 2 гадзіны дзеці так праводзяць, як хто хоча. Кожны робіць, што хоча. Паўтараю яшчэ раз, што ніякіх выкладаў беларускай мовы няма. Маем чатыры гімназіі і вось, прашу Высокую Палату, ані воднага гроша дагэтуль гэныя гімназіі ад ураду не дасталі.

Пан Міністар Бартэль, калі трэба было яму беларускіх галасоў пры выбарах прэзыдэнта, запрасіў мяне і пасла Ярэміча да сябе, пры гэтым хваліўся сваім радыкалізмам і сказаў: кажыце паны, чаго хочаце, а ўсякія магчымасьці таго, што паном запраўды належыць, тое паном будзе дана.

Мы скарысталі з тых прапазыцыяў, падалі бюджэт мінімальны на 1 048.000 зл. на школьніцтва, на культуру, на беларускія выдаўніцтвы, але Пан Бартэль, як прайшлі выбары і гэта яму не ўдалося, каб узяць нас на вуду, бо мы ўжо ня верым словам толькі дзейнасьці, чакаем на дзейнасьць, — зусім маўчыць. А беларускае вучыцельства, якое працуе ахвярна тры месяцы: травень, чэрвень і ліпень у прыватных гімназыях? Ані адзін з іх не атрымаў ані воднага гроша, дзеля таго што наша сялянства зьяўляецца пагалелым і калі плаціць за вучэньне дзяцей то зусім мала. Дык вучыцельства галадуе, але паміма гэтага вельмі ахвярнае для свайго народу. Дык ці-ж ня трэба нам змагацца? Усімі способамі мусім змагацца і пакуль урад ня зьменіць сваіх адносінаў да Беларусаў, датуль мы ня зьменім свайго становішча, згінем, але будзем змагацца.

Ня лепей стаіць справа з рэлігіяй як праваслаўнай так і каталіцкай. Вось, Пане Міністар, былі рэакцыйныя ўрады, насталі санацыйныя ўрады, але для нас усё адно. Ёсьць пуга, пуга і пуга. Адбіраньне царквы, адбіраньне царкоўных дамоў, адбіраньне царкоўных лясоў, ніш-

чэньне царквы. Каб ня быць галаслоўным, мушу падаць гэткі факт. Цэрква у Новым Двары была збурана. І вось гэтая царква стаіць да гэтай пары неадбудаванай, ня гледзячы на тое, што Соймавая Камісія на чале з паслом Тугутам пастанавіла, каб гэтая царква была папраўлена на дзяржаўны кошт. (П. кс. Ількоў: хто збурыў?) Палякі збурылі, каталікі. (П. Казлоўскі: камісія ня мае права нічога пастанаўляць). Далей адбіраюць старую праваслаўную царкву ў Маламажэйках, якая яшчэ ад XV сталецці была праваслаўнай. Гэта гістарычная праваслаўная сьвятыня. Далей маем Сталовічы, мястэчка Баранавіцкага павету. Пане Міністар, касьцёл ёсьць там вельмі вялікі (пышны), праўда ёсьць праваслаўная царква і ізноў скажу, праўда, гэтая царква перароблена з касьцёла, але прашу Паноў, калі Паны зьяўляецеся грамадзянамі, калі Паны зьяўляецеся людзьмі і калі не патрэбен будынак для рэлігійных мэтаў, дык што-ж Вы будзецэ з ім рабіць? Будзеце ксяндза туды садзіць, каб меў адзін 100 прыхажан і другі 100 і затым будыніна гэтая будзе стаяць пустой. Дык ці-ж ня можа праваслаўпая царква з гэтага карыстаць? (перарываньне).

Далей, у Сеняўцы, Нясьвіскага павету царква мае лес. Той лес царкоўная ўлада хацела выкарыстаць па рэмонт праваслаўнай царквы, аднак урадавыя дзейнікі адбіраюць гэны лес, адбіраюць для дзяржавы і гэтым не даюць праваслаўнай люднасьці магчымасьці карыстацца з таго, што да яе бяз сумліву гістарычна належыць (П. Мантэрыс: Польскаму духавенству таксама забрана).

Констытуцыя гварантуець усялякія правы, але Польскі Урад езуіцкім манерам, як раней так і цяпер ня дае грамадзянства праваслаўным ксяндзам. Дзеля таго, каб з іх мець прылады дзеля палянізацыі, дзеля пыканы (пасьмехі) над праваслаўнай рэлігіяй, бо праваслаўны ксёндз, ня маючы польскага грамадзянства мусіць кланяцца кожнаму лепшаму шляхціцу і нават пастарунковаму, бо той пастарунковы зараз данясе, што гэты ксёндз ёсьць палітычна нядобраверны і яго выкінуць і не дадуць яму магчымасьці спраўляць свае абавязкі.

Што датычыць бюджэту на рэлігійныя справы, дык маем для вызнаўцаў веры праваслаўнай прадбачаную ў бюджэце суму 1.695.980 зл. Дзеля таго, што народ праваслаўны адносна да каталіцкага можна выразіць лічбамі 1 да 6, то праваслаўныя—маюць права на $3^1/_2$ мільёны, дык нам належыць найменш цыфра (сума) — 3.337.000 зл. 60 гр. Аб гэтым гавора ня толькі пас. Рагуля, але аб гэтым гаворыць і гэтага просіць праваслаўны Мітрапаліт, з той толькі рожніцай, што я ня іду на ўгоду, а Мітрапаліт ідзе на ўгоду, але нічога з яе не скарыстае, нічога ня будзе мець. Мала гэтага, ад таго, што даецца, яшчэ частка адбіраецца назад. Урад нешта забірае сабе. З гэтых сумаў, якія былі прэлімінаваны ў апошнім годзе рожнымі выкрутамі, недалі скарыстаць. Урад іх затрымаў. Перад Эўропай гаворыцца і пішыцца, што даецца 1.600.000 на праваслаўную рэлігію, але пасьля можа дастанецца 400,000 ці 500.000 толькі, аднак аб гэтым будуць маўчаць, або скажуць толькі, што даецца, але што з гэтага? Яны ня могуць скарыстаць.

Далей гвалтам протэгуецца (падтрымліваецца) вунія і гэта такім манерам, што калі, скажым, царкоўная ўлада пераносе праваслаўнага ксяндза ў якую небудзь парахвію, дзе быў здраднік, рэнэгат ксёндз праваслаўны, які перайшоў на вунію, дык сьвецкія ўлады не зацвярджаюць новага праваслаўнага ксяндза і духоўная ўлада мусіць яго пераносіць з паваротам, але там яго таксама не зацьвярджаюць і ён астаецца паміж небам і зямлёй (Голас: Камінскім). Вось гэтакі выпадак быў з ксяндзом Карабчыком і Казлоўскім. Можа ёсьць і нейкі іншы.

Што датычыцца каталіцкага касьцёла, дык каталіцкая рэлігія зьяўляецца прывілегіяванай рэлігіяй у Польшчы, але гэта толькі для Палякаў. Для Беларуса католіка рэлігія зьяўяецца прыладай дэнацыяналізацыі яго, прыладай угнятаньня яго (п. Васынчык: праўда, кс Гадлеўскі). Вось конкордат налажыў на біскупаў паліцэйскія функцыі і гэтыя функцыі іх эксцэленцыі выконваюць вельмі старанна, вельмі ахвотна і вельмі заўзята. Гэтак прыкладам віленскі арцыбіскуп Яблжыкоўскі, прыймаючы беларускую дэлегацыю, якая прасіла яго аб тым, каб узяў на ўвагу інтэрэсы беларускага народу, прыняў яе арогацкім манерам, казаў, што тут не карчма, пагражаў жандармамі, пагражаў пракурорам і ўсімчыста, чым можна было пагражаць. Вось, за расейскай пары, тое чарносоценскае праваслаўнае духавенства не даходзіла да гэткіх межаў! Барані Божа! Ніколі праваслаўны біскуп не пагражаў ні воднаму чалавеку, нават адшчапенцу, які лічыўся толькі фармальна за праваслаўнага, што забяруць яго жандармы, што будзе жаліцца пракурору і г. д.

Каталіцкія белар. ксяндзы пераносяцца з каталіцкіх беларускіх парахвіяў у польскія парахвіі, як гэта было з ксяндзом Рэшацем і іншымі. Далей кс. Шутовіча, з Браслаўскага павету, зусім увольнена з парахвіі за культурна-асьветавую беларускую працу, якраз за тое, што залажыў беларускі народны дом, пабудаваў яго бяз помачы Дзяржавы і другіх дзейнікаў, а толькі за беларускія сродкі. І вось яго выгналі на вікарага; затое арцыбіскуп карыстаецца з рэнэгатаў, беларускіх ксяндзоў, з іх помачы, як прыкладам, з такога рэнэгата кс. Бобіча. За ягонай помачай ня толькі вядзецца польская палітыка, але нават сіляцца адабраць праваслаўню царкву ў Ёдах, каб перарабіць яе на касьцёл, хоць мясцовая суменныя каталіцкія ксяндзы як беларускія, так і польскія з пагардай адносяцца да яго паступку ў гэтай справе.

Дзеля таго, што ня маю часу, дык мушу сказаць у канцы... (п. Мантэрыс: Дзе пан пойдзе?) Пойду, дзе хачу, але да пана не пайду. Пан пойдзе да мяне хлеба прасіць, бо пан мае бульбу, а я маю хлеб. (Голас: А ксёндз Гадлеўскі?) Ксёндз Гадлеўскі асуджаны на два гады.

Дык вось, Паны, канчаючы сваю прамову, скажу, што ёсьць яшчэ порах у порахавых складах і Беларусы дапнуць сваей мэты, здабудуць незалежнасьць Беларусі (п. Казлоўскі: Пойдзе пан у турму таксама).

Галасуем проціў бюджэту.

* * *

Не пяі ты, ліхі вецер — бура
Сумным тонам за вакном;
Мо' ты, хочыш маё сэрца лячыць
Доўгім, сумным вечным сном.
Не засну я сном магільным—вечным,
Кроў у жылах усьцяж кіпіць!
Хоць жыцьцё маё адныя мукі,
Але жыць — хачу я жыць!
Мо' на гібель мне сьпяваеш? Чуеш?
Сваю тайну мне адкры...
Што сказаці хочыш, што вяшчуеш?
Прашу, праўду гавары!

М. Пецюкевіч.

Памяці д-ра Яна Басановіча.

21 г. лютага перад паўднём у віленскай катэдры, кс. Арцыбіскуп Яблжыкоўскі адправіў жалобнае набажэнства. З амбоны папольску і палітоўску гаварыў кс. Краўяліс, характарызуючы с. п. Басановіча ў літоўскім жыцьцю на культурна-асьветвай ніве. Па набажэнстве працэсія рушыла на магільнік Роса. На чале працэсыі нясьлі вянкі вучні і вучаніцы літоўскіх школаў. За труною ішла радня, дэлегацыя з Коўна, літоўскае грамадзянства Вільні і інш.

На магільніку Роса, пасьля адсьпяваньня набажэнства выступалі прамоўцы: д-р Альсэйка, рэктар ковенскага унівэрсытэту М. Біржышка, прэзыдэнт м. Коўна І. Вілейшыс, сэн. В. В. Крыжаноўскі, пас. кс. А. Станкевіч пабеларуску, Рыйзін пажыдоўску, студ. ков. унівэрсытэту Чыбурыс, б. міністар асьветы д-р Юкантас, нарэшце студэнт У. С. Б. Р. Мацкевіч. Усе адзначалі, кто народ літоўскі страціў чалавека вялікай вагі і патрыёта, заслужанага ў справе адраджэньня Літоўскага Народу.

Вечарам адбылаcа ўрачыстая акадэмія, якую распачаў д-р Альсэйка; пасьля быў выбраны прэзыдыум у складзе: рэктара М. Біржышкі, праф. З. Жэмайтіса, праф. А. Янулайтіса, д-ра Іокантэса, кс. праф. Тумаса і бурмістра Коуна І. Вілейшыса.

Сваею прамовaю кс. праф. Тумас адзначыў ролю с. п. Басановіча ў адраджэнскім руху, уважаючы яго асобу як сымболь ідэі незалежнасьці Літоўскага Народу.

Па заканчэньні прамоваў у якіх усе прамоўцы адзначалі вялікія заслугі нябошчыка перад літоўскім народам і наагул чалавецтвам, д-р Альсэйка адчытаў атрыманыя тэлеграмы ад Літвіноў усіх старонак. Характэрна, што нават і абшарніцкая супалка ковенскіх Палякаў таксама са спагадай адчула сьмерць Басановіча.

Пасьля афіцыяльнай часткі гэтай хаўтурнай урачыстасьці распачалася канцэртная яго частка, якая складалася з выступленьня артыстаў ковенскай опэры п. Судэйкі і п. Грыгайцісовай, а таксама з літоўскага хору пад кіраўніцтвам гр. А. Крутуліса.

Па заканчэньні ўрачыстасьці прысутныя на салі адпялі літоўскі народны гімн.

Сьляпая тэндэнцыя.

„Dzieńnik Wileński", як запраўдны прафэсыянал, робіць надта лёгка сур'ёзныя вывады. Пахаваць нас яму нічога не каштуе: ну проста, чыркнуў пяром нейкі Каўнацкі ў 41 чорным па беламу і годзі — няма Беларусаў!... Чыркнуў яшчэ раз, дык ізноў даволі, каб скласьці сказ што мы ня хочам культуры беларускае, а надта жадаем культуры польскае.

Я не хачу рабіць закідаў польскай культуры, але мушу адзначыў, што гэтакія дапушчэньні „Dzieńnika" ня маюць ні перад сабою, ні за сабою, ні пад сабою, ні над сабою, ні справа і ні злева на'т аднэй маленькай ёты праўды. Калі-б прытарнаваць гэтакія вывады, якія падае „Dzieńnik", да каталіцкае часткі Беларусаў, дык гэта можна было-б апіраць на супольнасьці з Палякамі каталіцкай рэлігіі, але калі пад адну плошчу падводзіць і Беларусаў праваслаўных, дык гэта выклікае проста вясёлую усьмешку.

Гаварыць аб гэты Беларускаму Народу ня трэба, а калі гавару, дык толькі дзеля таго, каб вясёла і бадзёрна пасьмяяцца і сказаць, што мы Беларусы ёсьць, бо каб не было нас, дык паны з „Dzieńnika" не гаварылі-б аб нас, бо гаварыць аб тым каго, ці чаго няма, нельга; а калі гаворачы аб нас яны не прызнаюць нас, дык гэта— добра ведамая эндэцкая тэндэнцыя: пускаць пыл у вочы на супроць ветру, які зацярушыць гэтым пылам вочы таму самаму хто яго пусьціў. Бо ці-ж можна тлумачыць іначай вось гэтакія „краскі" з эндэцкае „оранжарэі" — „ўжо ў папярэднім артыкуле мы сьцьвярдзілі, што і ў запраўднасьці істнуе беларускі рух, але-ж да пачатку істнаваньня „беларускага народу" яму ёсьць яшчэ, надта далёкія". Дык ці-ж не зацярушаны вочы „Dzieńnika" пылам, пушчаным ім самым, калі баючыся за „утрату паветаў, з большасьцю праваслаўнага жыхарства" хваліць Бога за няістнаваньне Беларускага Народу? Дык хто, калі не народ Беларускі, творыць беларускі рух? І хто, калі не Беларусы, гэтыя вось праваслаўныя і каталікі?

Наагул з усяго „бальшавіцкага ўзору „Dzieńnika" вынікае адно, што так ці іначай, беларускі рух твораны Беларускім Народам трывожыць эндэкаў — разумеецца, што рабіць гэта ня можа тое, што ня істнуе! Значыць ня гледзячы на ўсялякія эндэцкія дапушчэньні Беларускі Народ — істнуе!...

Тое што ёсьць скулаю на эндэцкім целе і костках, дык у гэтым ня можа быць сумліву, у гэтым усе перакананы, дык і іменна ў гэтым і солідарны з „Dzieńnikiem" і згодны з гэтакім сказам, што ад гэтага будзе эндэцы „капут". Ясна, што польская культура ад гэтага толькі выграе, бо вызваліцца тагды з таго эндэцкага мяшка, у якім цяпер знаходзіцца, вызваліцца ад таго сьляпога шавінізму, якім цяпер ахопляна.

Скарга.

З жыцьця пад Польшчай.

Паседжаньне ў Сойме.

Найбліжэйшае паседжаньне Сойму будзе ў дню 1 сакавіка ў ваўторак.

Арышты ў Сельцах.

Віленскае „Słowo" 24.II. піша: У Сельцах паліцэйская ўлада арыштавала быццам акружны камуністычны камітэт, складаючыся з 60 асобаў пераважна Жыдоў. У памешканьні акружнага і павятовага камітэту быццам знайдзена вялікая колькасьць камуністычных адозваў, а таксама распараджэньні і інструкцыі з Масквы.

Злоўляны фальшыўшчыкі 20 залатовак у Пазнані.

Пазнанская паліцыя выкрыла на прадмесьці Гурчын шайку фальшыўшчыкаў 20-ці залатовак, якіх арыштавала ў памешканьні Аўшаркава ў часе фабрыкацыі фальшывых грошай. Канфіскавана запас паперы, вялікую колькасьць фальсыфікатаў яшчэ ня выканчаных, друкарню, літаграфію, клішэ і г. д. Чарырох сяброў шайкі пасаджана ў вастрог.

13-ці-гадовая маці.

У Лодзі нейкая 13-ці гадовая Гэновэфа, вучаніца пачаткавае школы, нарадзіла дзіцця. Як маладая маці, таксама і дзіця чуюцца добра, за тое малады бацька, 16-ёх гадовы хлапец, арыштаваны.

Дык кожны, хто ўмее чытаць, спяшайся выпісаць сваю газэту „Сялянскую Ніву".

НАВІНЫ.

— **Беларуская лекцыя.** У нядзелю 27 лютага а 7 гадз у вечары ў кватэры Інстытуту (Завальная 6—5) гр. І. Зянюк прачытае лекцыю на тэму: Зямельныя адносіны на Беларусі і аграрная палітыка канца XIX сталецьця. Уваход бясплатны.

— **Агульны сход Гуртка Б. І. Г. і К. ў Радашковічах.** У нядзелю 13.II. 27 г. у гадз. 7,30 веч. адбыўся агульны сход Гуртка Інстытуту з наступным парадкам дня: 1) справаздача старога ўраду; 2) выбары новага ўраду; 3) бягучыя справы.

— **Пажар у Радашковічах.** У нядзелю 13.II. 27 г. у 6 гадз. веч. выбухнуў пажар у Радашкавічах пры Віленскай вуліцы. Згарэў аграмадны ток (гумно) Нямцэвіча.

— **Суд над рэдактарам „Беларускай Справы“.** 21 г. лютага рэдактар газ. „Беларускай Справы“ Сымон Макулік за зьмяшчэньне ў № 22 верша пад наз. „Амністыя“ асуджаны на 1 год вастрогу і за зьмяшчэньне ў № 26, артыкулу пад наз. „Палітычныя вязьні г. Шленску да ўсіх работнікаў“—на 2½ гады крэпасьці. Гэтыя кары ўважаюцца за злучаныя.

Асуджаны рэдактар „Бел. Справы“ Сым. Макулік дзеля таго, што ня мог заплаціць аж 10.000 зл. каўцыі, як піша „Dz. Wil.“, каб быць на свабодзе і апэляваць, адпраўлены ізноў у вастрог, дзе ён находзіўся ад пачатку судовае справы.

Падаючы аб гэтым мусім заценіць, што ў прэсавых справах у Польшчы гэта ёсьць першы, гэтакі жорсткі прысуд, якога дагэтуль яшчэ ня было. І на вялікі жаль, трэба-ж было, каб зачаткавалася гэта іменна на беларускім рэдактары!

— **Выезд літоўскай дэлегацыі.** 23 г. м. выехала з Вільні ў Літву дэлегацыя, якая прыяжджала на хаўтуры с. п. д-ра Я. Басановіча.

— **Прызывы.** У палове траўня будуць пазваны на вайсковую службу навабранцы, што радзіліся ў 1905 і 1904 годзе, якім вайсковая служба была алложана, або якія мелі карты „надлічбовыя“. Адначасна будзе пазвана 50% навабранцаў, што радзіліся ў 1906 г.

— **Спадчына 1 міліён даляраў.** 16.X. 1925 г. ў Чыкага (ў Амэрыцы) памёр Якуб Стывоскі, які пакінуў па сабе, як спадчыну, адзін міліён даляраў.

Атрымаць гэтую спадчыну мае права жонка і трое дзяцей, якія няведама дзе пражываюць.

Калі хто ведае дзе яны жывуць цяпер, дык няхай падасьць іх адрэс у міністэрства заграінчых справаў, праўна-рэвіндыкацыйны аддзел у Варшаве, вул. Фрэдры № 3.

— **Рэгістрацыя Палякаў у Радавай Беларусі.** Згодна з весткамі з Менска, радавая ўлада пачала рэгістрацыю ўсіх Палякаў, якія пражываюць блізка граніцы. Ходзяць чуткі, быццам рэгістрацыя мае сувязь з намерам рад. улады, усіх Палякаў адправіць у глыб Расеі.

* * *

Хмары цёмныя нагналі
На душу маю —
Гора. Путамі сквалі
Душу сумную.
Гадам — вужам акруцілі
Спуталі на век,
Хмарай цёмнаю спавілі;
Дзе на гэта лек?
Можа вецяр лёгкакрылы
Спагадае мне?
Можа лес стары ды шумны
Сум мой разьвядзе?
Мо' маланка быстралётна
Сілаю сваей
Скрыша путы мімалётна
На душы маей?
Я-б свабодны запяяў-бы
Вольнымі грудзьмі,
Сьвет магутны праслаўляў-бы
З вольнымі людзьмі.

М. П.

Што дзеецца ў сьвеце?

Польска-эстонскі трактат.

19 лютага пасол Харват і міністар заграінчых спраў Ацкель падпісалі польска-эстонскі гандлёвы трактат, абапёрты на падставе найвялікшай льготнасьці.

Нямецка-літоўскі гандлёвы дагавор.

Газэта „Preussische Kreutzeitung“ атрымала весткі з Коўна, што літоўскі пасол у Нямеччыну, вярнуўшыся з Бэрліну ў Коўна, вёў абгавор з сваім урадам у справе стварэньня на шырэйшых, чымся дагэтуль было асновах гандлёвага трактату паміж Нямеччынай і Літвой. Літоўскае міністэрства заграінчых справаў мелася прыгатаваць адпаведны праект трактату.

Гэнэральная забастоўка ў Шанхаі.

У Шанхаі ўзнялася гэнэральная забастоўка, хто пратэст насупроць высадкі ангельскага войска і як сымпатыя да Кантончыкаў. Работнікі дамагаюцца, каб ангельскае войска пакінула Шанхай.

Усе паштовыя ўрадоўцы, трамвайныя, аўтабусавыя працаўнікі і працаўнікі французскіх канцэсіяў пакінулі працу. Лічба забастоўшчыкаў даходзіць да 40 тысячаў.

Тэрор і растрэлы ў Шанхаі.

У забастовачным руху наступіла пэўнае заспакаеньне (?) як сьледства шматлічобных экзэкуцыяў, дакананых над забастоўшчыкамі па загаду Сун-Шуан-Фанга. Растрэляна некалькі дзесяткаў правадыроў. Над кітайскаю часткаю места пануе тэрор. Галовы растрэляных павывешвалі на брамах места. Гэтак кажуць весткі з Шанхаю; з Лёндана таксама падаюць, што да агульнае забастоўкі, якая ахапіла 100.000 чалавек, далучыліся працаўнікі омнібусаў і нагул усіх сродкаў камунікацыі. Ваенны губэрнатар Шанхаю выдаў распараджэньне, у якім пагражае караю сьмерці павадыром забастоўкі. Ня гледзячы на гэтыя экзэкуцыі і тэрор, войска Ву-Пэй-Фу разаружылі манджурскі батальён войска Чанг-Цзо-Ліна; затрымалі цягнік з амуніцыяй. Сындыкат работнікаў у 1-Танг маніцца абвясьціць агульную забастоўку, кіруючы яе проці Англіі.

Вайна ў Кітаі.

Ваенны губэрнатар Шантунгу ген. Чанг-Цун-Чанг заняў Нанкін і ўзяў уладу над гэтым местам перагаварыўшы папярэдня з гэнэралам Сун-Чан-Фангам. Войска гэнэрала Фэнг-Тзвна дзержаць дазор над чугункай напоўдня ад Нанкіну, што дасьць магчымасьць паўночнай арміі сілай у 32.000 людзей, якая скора прыбудзе да Нанкіну, пераняцься хутка ў Шанхай і прыступіць да абароны гэтага места.

Масарык едзе ў Парыж.

Як паведамляе „Народная Палітыка“, чэхаславацкі прэзыдэнт Масарык 10 буд. сакавіка выяжджае на поўдзен Францыі, дзе прабудзе 12 дзён і адведае некалькі мест, маючых гісгарычнае значэньне. Пасьля паедзе ў Эгіпт.

Інтэрвэнцыя (пасярэдніцтва) Амэрыкі ў кітайскіх справах.

Марскія амэрыканскія ўлады атрымалі вестку, што амэрыканскі транспартоўны карабель „Chaumont“, з 120 маракамі на пакладзе, выплыў з Каліфорніі і падаўся ў Шанхай.

Арышт 11 ксяндзоў у Радавай Расеі і рэвізіі ў касьцёлах.

Як пішуць польскія газэты, у Петраградзе радавая ўлада арыштавала і пасадзіла ў турму гэтакіх ксяндзоў, абвінавачаных у контр-рэволюцыі: А. Васілеўскага проб. касьц. сьв. Кацярыны, Эд. Тройга пр. касьц. сьв. Станіслава, М. Шаўдзініса проб. Катэдры, Д. Іванова сэкр. курыі дыецэзыяльнай і П. Хоміча проб. касьц. сьв. Казіміра.

Гэтаксама арыштавана 12 сёстраў Францішканак і некалькі кандыдатаў на духоўны стан.

За гэты час радавая ўлада выслала на Салавецкія высьпы з Жытомерскай дыецэзіі: кс. кс. Сакалоўскага, Федаровіча, Славінскага, Крыўчука, Белагаловага і Ільгіна з Магілёва. Тамжа знаходзіцца асуджаны ў сваім часе і памілаваны кс. Зелінскі.

Усяго на Салавецкіх высьпах ёсьць 6000 палітычных вязьняў:

У часе арыштаў адбылася рэвізія ў парахвіяльных касьцёлах, а нават і ў французскай капліцы ў Царскім Сяле.

Бюджэт Радавай Расеі.

Згодна з данньмі радавага тэл. агенства ТАСС бюджэт Радавай Расеі г. г. прадстаўляецца гэтак:

Даходы аблічаны на 4.960.000.000 рублёў (3.850.000.000 руб. у лет. г.), г. зн. цяпер павялічаны на 28 проц.

Выдаткі аблічаны на 4.856.000.000 рублёў, якія перавышаюць на адзін міліярд леташнія выдаткі.

Звышка даходаў над выдаткамі тэорэтычна аблічана на 104 міліёны рублёў.

Выдаткі на народную гаспадарку маюць выносіць 62 проц. усіх выдаткаў, ці 2.725.000.000 рублёў. На мясцовыя бюджэты асыгнавана 480 міліёнаў руб.

Выдаткі на культурна-сацыяльныя патрэбы выносяць 923 міл. рус.

Выдаткі на абарону дзяржавы — 692 міл. руб. (604 ў лет. годзе).

Абасноўваючы вайсковы бюджэт, Бруханаў сказаў, што звышка выдаткаў на войска ня ідзе на павялічэньне лічбова арміі, а выключна на матэр'яльнае і культурнае палепшаньне войска. Выдаткі на войска становяць 14 проц. усяго бюджэту тагды, калі суседнія (мова пэўне была аб Польшчы) выносяць 33 процэнты бюджэту.

Безпасярэднія падаткі складаюць 768 міл., пасярэднія 1.368.000, мыта—173. Даходы ад прамысловасьці, гандлю і банкаў—276. Унутраньні бюджэт выносіў 1 студзеня 1927 году 756 міл. (440 ў лет. г.).

Пагоршаньне дыпляматычных адносінаў паміж Англіяй і Саветамі.

З Лёндану пішуць, што 23 г. м. савецкаму паўнамоцніку даручана нота ангельскага ўраду, якая сьцьвярджае, што адносіны ангельска-савецкія не перастаюць быць яўна незадавальняючымі. Прыпамінаецъ яна таксама, што папярэднія пратэсты ангельскага ўраду проціў зневажаньня Вялікай Брытаніі і прапаганды аб сусьветнай рэвалюцыі не былі задаволены. Закіды, што нібы ангельскі ўрад меўся належыць да тых згаворшчыкаў, якія імкнуліся да скасаваньня савецкага ладу, не згаджаюцца з праўдай. Далей нота адзначаець, што пацьверджаньне Рыкава і Бухарына, нібы проціангельскія выступленьня не падтрымліваюцца Саветамі і астаюцца яўна недаказанымі. Нота падчыркавае, што ў ангельскім грамадзянскім судзе ёсьць граніцы, якія было-б для Саветаў небясьпечным пераходзіць. Калі Саветы і далей будуць вясьці тую самую палітыку, дык наступе сарваньне ангельска-расейскага гандлёвага дагавору, які ўжо цяпер астаецца відавочна нарушаным, а нават можа дайсьці да сарваньня звычайных дыплёматычных зносінаў. У канцы ўрад адзначае сваю надзею, што гэта нота будзе прынята Саветамі пад увагу і далейшых жальбаў ня будзе.

Дымісія эстонскага габінэту.

З Таліна паведамляюць, што 23 г. м. эстонскі габінэт пайшоў у дымісію. Прычынай да гэтай дымісіі было галасаваньне ў парляманце, які 64 галасамі проці 27 прызнаў прапазыцыю сьцьвярджаючую, што распараджэньне міністра ў справе самаўрадавых выбараў зьяўляюцца супярэчнымі з выбарнай практыкай.

Трасеньне зямлі і выбухі вулканаў.

Як наказваюць з Парыжа, з усіх старон сьвету даходзяць весткі аб трасеньнях зямлі і нязвычайных бурах.

Гэтак у паўднёвай Францыі ў мясцовасьці Сэн у ночы з 17 г. лютага чутна было цэлы рад моцных трасеньняў зямлі. У некалькіх мясцох рухнулі будынкі.

Ізноў з Рыму прыходзяць весткі, што сэйсмографічная станцыя ў Фээніі запісала вялікае трасеньне зямлі, якое трывала каля 4-х гадзін у адлегласьці 8800 кілямэтраў. Асяродак гэтага трасеньня ляжыць, пэўна, на канцы паўночнае Азіі.

Таксама даносяць з Кангару, што даўнейшы вулкан Сорын на пабярэжжы Чорнага мора раптоўна ізноў выбухнуў, залываючы лаваю і засыпаючы попелам некалькі мясцовасьцей. Дамоў шмат зьнішчана, многа асобаў забіта.

Нарэшце даносяць з Амэрыкі, што магутны паветраны віхор учыніў вялікія шкоды ў штатах Люізіяна, Георгія і Місісіпі. 30 асобаў забіта, каля 300 ранена. Паветраны віхор, які надышоў са штату Тэксасу зьніштчыў на вялікім абшары нафтовыя мясцовасьці і плянтацыі. Вялікія спусташэньні гэтак сама зазначана і ў Канрасе.

Браты Беларусы!

Зварочваемся з брацкім клічам, ахвяруйце кніжак у рожных мовах у нашу бібліатэчку-чытальню. Кніжка гэта ёсьць духовым пажывам для нас, кніжка—зярно культуры, родная кніжка—аружжа на цемру, кніжка—сьмерць злыбядзе! Дык адгукніцеся Браточкі на наш кліч!

Кніжкі можна пакідаць у Вільні — Завальная 7, кнігарня „Пагоня“ можна перасылаць па такім адрасе: м. Радашковічы, бібліатэка-чытальня Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

Урад Гурка Інст. у Радашковічах.

Да нас пішуць.

Культурная праца.

(Радашковічы, Маладэчанскага пав.).

У нас ёсьць Гурток Інстытуту, які вельмі інтэсыўна працуе. Між іншым гэты Гурток узяў пад сваё кіраўніцтва бібліатэку-чытальню, якую залажыў Аддзел у канцы мінулага году, і так здолеў паставіць на ногі гэту бібліатэчку, што проста на дзіва. Толькі вось бяда, што кніжак ня шмат, а газэт і журналаў небеларускіх бадай зусім няма. А ўсяму гэтаму віна тая, што няма грошы на выпісываньне. Толькі адна ўкраінская газэта спачувае нашай беднаце і прходзіць да нас, прыносячы весткі аб сваім Народзе, г. зн. газэта „Украінская Грамада“. Аднак нягледзячы на гэта наша бібліатэка-чытальня многіх Радашкоўцаў загіпнатызавала і прывабіла да сябе і прываблівае, пры гэтым шмат асьведаміла і асьведамлівае. Зайдзі ў нашу бібліатэчку ў гадзінах ад 5—7 веч., то заўсёды ўбачым поўную людзей: моладзі і старых чытаючых газэты, пазычаючых кніжкі. То нядзіва, што моладзь так цікавіцца, але старыкі і старухі, якія нядаўна лічылі сябе Палякамі, або Расейцамі, а цяпер адкрыта і сьмела кажуць, што: „Мы Беларусы!“

Ня можна сказаць, што ўсе Радашкоўцы прыхінуліся да нас; ёсьць яшчэ такіх, якія яшчэ думаюць „як індыкі“... куды пахінуцца, а ёсьць таксама і паўдуркаў, якія сьмяюцца з сьвядомых беларусаў і нават стараюцца рабіць рожнага роду прыкрасьці і авантуры. Аднак мы на іх не зважаем і будзем працаваць над пашырэньнем роднага слова, культуры, над усьведамленьнем нашых шэрых масаў.

Наш Гурток Інстытуту мае ўжо каля 20-ёх сяброў, хлопцаў і дзяўчат, хоць іх ня шмат, аднак сьвядомыя, працавітыя і здольныя да працы. Нашы сябры і сябрўкі ўсе, што дааднаго, шчыра працуюць і ахвоча. Калі-ж далей з гэтакай інтэсывнасьцю будуць працаваць, то бязумоўна вялікую карысьць прынясуць, як для сябе, так і для свайго Сярмяжнага Народу.

Прыдзем на нашу вечарынку, дык проста міла паглядзець. Казаў-бы, там кожная асоба інтэлігентная, або адукаваная вельмі. Тут проста сказаў-бы Божая сямейка. Кожны, адзін другога, называе сябрам, шануюць адзін другога. Перадусім вядуць дыскусіі на паважныя тэмы, ладзяць тварыскія гульні, дэклямуюць вершы, пяюць песьні, а таксама і танцуюць, перадусім сваю нацыянальную „Лявоніху“.

Вось гэткія прыкладныя вечарынкі нашы і пачалі прыцягіваць да нас Радашкоўскую моладзь.

Спагаднікі культуры.

(Давучын, Пружанскага пав.).

Няведама з якіх крыніц, наша мясцовая паліцыя, даведаўшыся аб арганізацыі ў нашай вёсцы Гуртка Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры, калі яшчэ фактычна Гурток ня быў залегалізаваны, а ішла толькі гутарка аб арганізацыі яго, каб тэрарызаваць пачын,—паліцыя зрабіла вобыск у гр. Гр. Куроўскага (старш. Гуртка). Вобыскі рабіў камандант Дабучынскага пастар. Бэрнадзкі з паліцыянтам Нядзьведзкім. Ведама ад гр. Куроўскага зажадалі выдачы аружжа і нелегальнай літэратуры. Але пры рэвізіі нічога не знайшлі, апрача некалькі нумараў „Сялянскае Нівы“, статуту з рэгулямінам Б. І. Г. і К. і 3 лісты ад знаёмых.

Пры спісаньні пратаколу дапрос быў скіраваны на арганізацыю і істнаваньне Грамады, да якое гр. Куроўскі не належыць. 25.І. на гэтай самай падставе быў зроблены вобыск ў гр. В. Саўчыца 16 л. хлопца, які фактычна лічыцца скарбнікам Гуртка Б. І. Г. і К. Пры вобысках таксама нічога не знайдзена. Пры спісаньні пратаколу яго абзывалі арганізатарам бандыцкай камуністычнай партыі, аб істнаваньні якой ён зусім ня ведае. П. Бернадзкі пагражаў яму, што ён яшчэ малады да арпанізацыяў, ня можа належыць, але той адказаў, што: „Нас да гэтага часу дзяржалі ў цемры, а цяпер хочам культуры і асьветы, разам як старыя, так і маладыя“.

Ня гледзячы на ўсе перашкоды з боку адміністрацыі мы яшчэ ахватней і дружней бяромся за культурную працу, на карысьць свайго народу.

Віч.

Белавеская пушча.

Белавеская пушча — гэта запаведнік лясоў Беларусі. Паміж іншым, да вайны славілася зубром, якога не знайсьці было ўва ўсёй Эўропе. Цяпер зубр прапаў; прападае і сама пушча ад чалавека з пілой і сякерай у руках. На гэтым няшчасьці здабываюць сабе шчасьце розныя фірмы са сваімі бязлікімі прадстаўнікамі, ды купцы; валяцца тысячагадовыя дубы, зьніштажаюцца толькі што пачаўшыя жыці маленькія дрэўкі.

У сучаснасьці пушча мае выгляд, — якбы поле пасьля бойкі. Ад нападкаў чалавека на безбаронны лес засталіся толькі пні, якія напамінаюць нам магільныя памятнікі, сьведчачы аб тым, што ня гэтак даўно тут быў адвечны лес з аленем, зубром і іншай зьвярынай.

Хоць нешта і насаджваецца на высячаных мейсцах, але-ж ці можа чалавек зьнішчыўшы, зрабіць ізноў гэтак як было створана прыродаю?

З болькаю ў сэрцы паглядае на гэтую пагубную пасеку селянін, у якога пасьля вайны не асталося хаты, якое і да гэтуль няма. Дый як-жа іначай? — Усё вывозіцца, а нам астаюцца, толькі пні як памятнікі аб былай вялікасьці, якая, ад цяперашняй гаспадаркі над пушчаю, пашла намарна.

Санурак.

Новая мова.

(Лыскава, Ваўкавыскі пав.).

Вось, чытачы, наперад дагадаецеся, што я хачу гэтым сказаць?!...

Дзеля таго, што адгадаць гэта здаецца будзе цяжкавата, бо можна падумаць розна, я пасьпяшаюся, ня турбуючы Вас; паясьніць, што значыць гэтая — новая мова!

Беластоцкі ваявода гэтымі днямі, у сувязі з апошнімі арыштамі выдаў адозву да народу, заклікаючы да супакою; але справа ня ў гэтым, а ў тым што гэтая адозва пісана дваякім шрыфтам: першы шрыфт гэта польскі і мова польская, а другі шрыфт — кірыліца, але яе мова, дык зусім новая. Да таго новая і гэтак спрытна камбінаваная, што нельга зразумець — ці яна расейская, ці польская, ці беларуская, ці проста ніякая. Але-ж гэта мелася быць беларускай мовай.

Хоць пісаць аб „добрых зьявах“ нам забаронена, хоць канфіскуюць за гэта нашу газэту, хоць гавораць да нас на нейкай не істнуючай мове, але-ж факт на яве — загаварылі па новаму. Гэта сьведчыць што ўжо, хоць яшчэ блага, але-ж лічаць нас за сілу.

Пігань.

Бяззямельле.

(Несьвіжскі пав.).

Тое бяззямельле, якое адчуваем мы, сяляне, прымушае сур'езна над гэтым задумацца. Што-ж будзе далей? Як мы будзем жыць? Калі цяпер няма на чым жыць, дык на чым-жа будуць жыць нашыя дзеці, унукі, якая іх сустрэне доля, будучыня? Можна сказаць, што калі зробіцца нешта асабліве ў нашым сялянскім жыцьці, што карэнным чынам, зьменіць сучасныя варункі жыцьця, дык іх будучына будзе, папраўдзе жудасная, страшная. Дзеля прыкладу, вазьму маленькі факцік. Пасьля выхаду з паншчыны вёска Б—чкі, Нясьвіскага пав., мела зямлі 224 дз. З гэтай лічбы ворнай зямлі было 88 дзес., непрыдатнай 92 і пожнеў 44 дз Разьбіўшы гэта на адзінаццаць паўвалок будзем мець на кожную па 20 дз. 892 кв. саж. Дапусьцім, што кожны гаспадар быў жанаты, меў 3 дзяцей, трымаў 1 каня, 1 вала, 2 каровы, 2 сьвінь, 4 авечкі. Перамножыўжы гэта, будзем мецi, што на 224 дз. жыло 55 душ, было 11 каней, 11 валоў, 22 каровы, 22 сьвіньні, 44 авечкі. Прайшло 65 з гакам год. На той-жа самай зямлі аказалася: замест 11 гаспадароў 68. Сям'я кожнага гаспадара, цяпер маецъ найменш 4 душ, агулам 273 душы. Каней 44, кароў 110, цёлак 66, авечак 77 і сьвіней 55. Адкінуць з 224 дз. 92 дз. непрыдатнай, занятай пад ямамі, кустамі, будзем мець, што толькі 132 дз. у заправуднасьці пракармліваюць 273 душы і 342 галавы рознай жывёліны.

Праўда, гэтыя лічбы дзе небудзь у іншым месцы невялічкія, як напр. Нямеччына, але ў нас пры нашай адсталасьці ў вядзеньні гаспадаркі і агульнай цемнаце, трэба прызнаць, за высокія. Фактычна разьдзяліўшы апошнюю дзесяціну зямлі на тры часткі, з каторай трэба ня толькі самаму пражыць з сям'ёю, пракарміць жывёліну, але і пабудавацца, няма дзіву, што чалавек зусім галее. Мы дык хоць яшчэ дзелім хоць на часткі сваю дзесяціну, а што-ж будуць дзяліць нашы дзеці? Каб нашы дзеці ня мерлі з галадухі ў той жудаснай, але недалёкай будучыне, нам трэба ні на мінуту ня спыняць свеай барацьбы за зямлю. Найлепш гэта вясьці арганізаванным шляхам, пад сьцягам нашага Сялянскага Саюзу.

Бяззямельны.

НАШАЯ ПОШТА.

Гр. Садоўскім: Друкі паслалі Вам.

М. Запольскаму: Артыкул атрымалі. Добра было-б яго зьмясьціць у літэратурнай часопісі.

Лірыку Сьлёзцы: „Волата“ атрымалі. Пасылайце матэр'ялы на Завальную 6—5.

Грышкевічу: арт. „Б. Спіноза“ атрымалі.

С. Пяюну: Вершы атрымалі.

Стары Хрын: Карэспандэнцыю дасталі, пастараемся зьмясьціць.

Крэсу А., Ляшковічу Ф., К. Бабако, Ал. Касяку, Н. Цару, Н. Макоўскаму, Л. Аляксейчыку, С. Хмелю, П. Ёлоб, В. Казакевічу, Я. Філіановічу, К. Івашкевічу, Н. Нарэйко, М. Смаленскаму, Ф. Радзевічу, А. Астапкевічу—пробны нумар паслалі.

Кернодзе М., Ломшыку К., Лемяшонку М., Кузьніцкаму Ів. — газэту пасылаем.

Дасталі ад:

Грыдзюшко Антона 3 зл.

Забачэўскага Г., Юстына Болвана, Бандарэнкі Уладысл., Мілоша Івана, Куніцы Б., Салінскага А., Тодарчыка А. — **па 2 зл.**

Канюха Аркадзя, Шумолінскага Б., Каролькіна А., Тодарчыка В., Курынкі А., Шчаснага А., Засьцекоўскага Б., Маліка А., Корвіна Б., Заельніка А. — **па 1 зл.**

БІРЖА.

Вільня, 24.ІІ. 1927 г.

ВАЛЮТЫ:

Даляры	8.90—8.92 зл.
Рублі зал. (10 р.)	47.25—47.35 „

ЗБОЖЖА, ЗЕМЛЯРОБ. І ІНШ. ПРАДУКТЫ:

Вільня, 22.ІІ. 1927 г.

Жыта за 100 кг. (6 пуд.) . .	42.00—43.00 зл.
Авёс „ „ . .	36.00—37.00 „
Ячмень брав. „ . .	35.00—37.00 „
„ на кашу „ . .	00.00—00.00 „
Пшаніца „ . .	50.00—51.00 „
Сланіна тутэйшая І гат. 1 кг. .	3.50—4.30 „
Клустасьць свінная „ . . .	4.30—4.60 „
Масла несал. за 1 кг.	6.00—8.00 „
„ салён.	5.00—6.20 „
Сьмятана за 1 літр	2.50—2.80 „
Яйкі за 1 дзес.	2.30—2.50 „
Дровы сасн. за воз	10.00—14.00 „
„ „ „	11.00—14.00 „

Рэдактар і выдавец К. Мацкевіч.

Беларуская Друкарня ім. Ф. Скарыны, Вільня—Людвісарская 1.